адказ. Перш за ўсё неабходна сфарміраваць здольнасць угадваць наперад, як ініцыятыўная рэпліка можа ўздзейнічаць на суразмоўцу, і ў сувязі з гэтым планаваць сваю наступную рэпліку.

Адзначым яшчэ адно неабходнае ўменне – удасканальваць камунікатыўны намер суразмоўцы, які прагназаваўся на аснове ўласнай ініцыятыўнай рэплікі і пачатку рэплікі ў адказ. Па пачатку рэплікі ў адказ адзін з суразмоўцаў зразумее настрой другога і яго адносіны да сітуацыі, а канец рэплікі дае магчымасць зразумець, ці быў прагноз правільным.

І апошняе – фарміраванне ў суразмоўцаў здольнасці бачыць, ці ёсць логіка ў думках таварыша, і разумець галоўнае ў яго пункце гледжання ў канцы дыялога, аб'ядноўваць выказанае ім у адным сказе.

**У.У.Гілеўскі**, *выкладчык*

## ТРАДЫЦЫІ КАФЕДРЫ ЯК СКЛАДАЮЧАЯ ВЫХАВАННЯ І ТВОРЧАГА РАСКРЫЦЦЯ АСОБЫ МЕНЕДЖЭРА САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ

Для ўдасканальвання майстэрства студэнтаў творчых кафедраў БДУ культуры і мастацтваў праводзіцца шэраг цікавых фэстываляў і мерапрыемстваў. Сярод іх інаўгурацыя кожнага акадэмічнага года, навагоднія святы, фестываль студэнцкага гумару «Гумарына», фестываль мастацтваў «Арт-мажор» і інш.

Але ва універсітэце навучаюцца таксама студэнты, чыя прафесійная дзейнасць не звязана непасрэдна з мастацтвам. З мэтай падтрымкі гэтай часткі студэнтаў, іх маладзёжных ініцыятыў у сферы культурнага адпачынку, далейшага развіцця студэнцкіх традыцый праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы. У ліку іх агульнауніверсітэцкі конкурс-фестываль студэнцкай творчасці «Сем муз», дзе актыўна ўдзельнічаюць студэнты кафедры менеджменту сацыякультурнай сферы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У працэссе правядзення навагодніх свят студэнты гэтай кафедры калектыўна вылучаюць кандыдатуры сваіх выкладчыкаў у гумарыстычныя намінацыі: самы вясёлы выкладчык, самы шчодры, самы вынаходлівы і інш. Аб'яўленне намінантаў адбываецца на ўрачыстым віншаванні лепшых па прафесіі разам з уручэннем грамат і падзяк ад рэктарата універсітэта.

У плане работы кожнай кафедры ёсць мерапрыемствы, якія служаць культурнай арыентацыі студэнтаў.

Выкладчыкі кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай сферы асаблівую ўвагу ўдзяляюць тым святам, якія маюць дачыненне да будучай прафесіі студэнтаў. Дзень турызму, Дзень тэатра, Дзень музеяў будучыя менеджэры лічаць сваімі прафесійнымі святамі і абавязкова рыхтуюць да іх культурна-адпачынкавую праграму ці выпускаюць газету.

Вось ужо некалькі гадоў куратары акадэмічных груп кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай сферы лічаць сваім абавязкам падрыхтаваць са студэнтамі мерапрыемствы да ўдзелу ў міжнароднай акцыі «Дзеячы культуры і творчая моладзь супраць СНІДу», якая праходзіць 1 снежня. Здароў'е моладзі – гэта багацце нацыі. Таму спектакль-акцыя, ці гутарка з медыкамі, ці проста інфармацыя аб статыстыцы захворванняў па рэспубліцы – усё гэта служыць высакароднай мэце захавання здароўя будучых спецыялістаў.

Акрамя таго, на кожнай кафедры арганізуюцца свае культурна-масавыя мерапрыемствы, якія сталі ўжо традыцыйнымі. Кафедра менеджменту сацыяльна-культурнай сферы традыцыйна два разы ў год праводзіць "капуснік". У пачатку акадэмічнага года гэта мерапрыемства прысвячаецца студэнтам І курса, якія толькі ўліваюцца ў студэнцкую сям'ю, а ў маі –выпускнікам.

Капуснікі садзейнічаюць захаванню трывалай сувязі з выпускнікамі. Былыя выпускнікі заўсёды жаданыя госці на кафедры менеджменту сацыякультурнай сферы. На кафедры маладыя спецыялісты могуць атрымаць кваліфікаваную кансультацыю, неабходную падтрымку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кафедра менеджменту сацыякультурнай сферы супрацоўнічае з рознымі ўстановамі культуры ў працэсе арганізацыі практычнай дзейнасці студэнтаў і іх вольнага часу. Нашых студэнтаў ведаюць як добрых арганізатараў, удзельнікаў і ўдзячных гледачоў розных мерапрыемстваў. Вельмі цікава была арганізавана нядаўна на кафедры прэзентацыя новага маскоўскага часопіса «Арт-менеджер». Разам з выкладчыкамі ў ёй прымалі ўдзел і студэнты. Яны адзначалі, што часопіс будзе карысным у іх творчай і практычнай дзейнасці.

Свой уклад уносіць кафедра ў рэалізацыю праграмы «Турызм і адпачынак». Многія з нашых студэнтаў мараць працаваць у турыстычным бізнесе. Праграма "Турызм і адпачынак" прадугледжвае правядзенне маршрутаў выхаднога дня, выезды на прыроду, аўтобусныя экскурсіі: «Жыровіцкі манастыр», «Нясвіж», «Мінск-герой», «Дудуткі», «Мірскі замак» і інш. У працэсе рэалізацыі праграмы "Турызм і адпачынак" студэнты вучацца вырашаць задачы арганізацыі і правядзення злётаў і спаборніцтваў, аказваць кансультатыўную дапамогу ў падрыхтоўцы турысцкіх паходаў і інш.

Значная ўвага на кафедры надаецца фарміраванню і развіццю творчых студэнцкіх калектываў. Так, напрыклад, дзякуючы намаганням выкладчыкаў рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм на кафедры стварыўся цікавы эстрадны дуэт «ТТ», які працуе ў гутарковым жанры. Створаны і іншыя калектывы. Гэта заслуга актыву студэнцкага самакіравання.

За дзесяць гадоў свайго існавання кафедра менеджменту сацыякультурнай сферы сфарміравала цікавыя традыцыі, якія аказваюць станоўчы ўплыў на фарміраванне асобы будучага спецыяліста і яго прафесійных якасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ